# Даверліва пра хвалюючае

**Намеснік міністра адукацыі Кацярына Пятруцкая правяла “Бацькоўскі НЕсход” на ААТ “Полацк-Шкловалакно”.**




Размова ішла пра самае галоўнае — нашых дзяцей, сямейныя каштоўнасці і праблемы, пераемнасць пакаленняў, важнасць жывых зносін дзяцей і бацькоў. Вялікі сямейны савет адбыўся ў рамках праекта “Бацькоўскі ўніверсітэт”.

— Няма чужых сыноў і дачок, гэта ўсе нашы з вамі дзеці, — звярнулася да прысутных намеснік міністра адукацыі. — У выхаванні будучых грамадзян і патрыётаў роднай краіны, у выхаванні майго сына і вашых дзяцей няма нязначных дробязей і не павінна быць абыякавых. Калі вы бачыце, што чыйсьці сын ці дачка творыць нягоднае, трэба зрабіць заўвагу, каб спыніць і даць дзіцяці нагоду задумацца: яго не падтрымліваюць, учынак дрэнны. Так разам мы выхаваем добрых людзей.

Даверлівая гутарка закранала шэраг пагрозлівых выклікаў сучаснасці: небяспеку, якую нясе ў сабе інтэрнэт, прафілактыку дэструктыўных паводзін, булінгу, наркаманіі, суіцыдаў, неабходнасць цеснага кантакту сям'і, школы і грамадства ў выхаванні падрастаючага пакалення.

— У сям'і мы сталі крытычна мала размаўляць адно з адным, парушаецца сістэма ўзаемасувязі пакаленняў, — акцэнтавала ўвагу Кацярына Пятруцкая. — Ці задумваліся вы, колькі хвілін штодня ў вас займаюць жывыя зносіны з дзецьмі? А калі параўнаць з часам, праведзеным кожным членам сям'і ў інтэрнэце? Між тым у дзіцячым успрыманні гэта закрытая прастора, якая не кантралюецца намі. Заўсёды памятайце: калі дзіця, знаходзячыся дома, блукае ў інтэрнэце, то яно не дома і не ў бяспецы. Праблема сур'ёзная. Закрываць на гэта вочы — маўляў, “мяне гэта не тычыцца” — не даводзіцца нікому з нас.

Варта адзначыць, што ў пытанні, хто нясе адказнасць за выхаванне дзяцей — школа, бацькі ці грамадства, удзельнікі сустрэчы амаль адзінагалосна выказаліся: сумесна. У сваю чаргу спікер папрасіла падтрымаць школу і нашых дзяцей. Сёння настаўнікам вельмі патрэбна дапамога бацькоў. Кожнае дзіця павінна разумець, што школа і сям'я — гэта адзінае цэлае, адзіныя патрабаванні.

— Вельмі важна, каб у любой сямейнай справе, будзённых клопатах дзеці былі вашымі першымі памочнікамі і саюзнікамі, — заклікала бацькоў Кацярына Пятруцкая. — Калі ласка, пачніце з сябе. Не “шкадуйце” іх, вымушаючы шукаць замену адзіноце ў інтэрнэце. Прыцягвайце дзяцей да працы, паўнавартаснага ўдзелу ў жыцці сям'і. Каб нашы блізкія людзі адчувалі, што яны нам насамрэч цікавыя, што мы шчаслівыя разам, каб дзеці выраслі лепшымі за нас, сталі нашай надзейнай апорай, стварылі свае сем'і, нарадзілі нам унукаў. Тады будзе ў нас і моцная сям'я, і моцная дзяржава.

Таксама намеснік міністра адукацыі правяла на базе сярэдняй школы № 16 Полацка рабочую нараду з адказнымі за арганізацыю праекта “Бацькоўскі ўніверсітэт” у Віцебскай вобласці і сустрэчу з калектывам ПДУ імя Еўфрасінні Полацкай.

**Таццяна БОНДАРАВА.**
**Фота аўтара.**